А. М. ВОІНАВА, А. М. ЕРМАКОВА
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай мовы

# АПТЫМІЗАЦЫЯ НАВУЧАННЯ ЛІНГВІСТЫЧНЫМ ДЫСЦЫПЛІНАМ

Аптымізацыя навучання вызначаецца як від дзейнасці, накіраванай на выяўленне і выбар розных метадаў ці варыянтаў навучання, вызначэнне ступені яго адпаведнасці мэтам, арганізацыя навучальнага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

працэсу. Адной з вядучых характарыстык аптымізацыі навучання з’яўляецца яе працэсуальнасць, у якой вылучаюцца чатыры аспекты: заканамерны характар,стадыйнасць, наяўнасць унутраных фактараў і знешніх умоў праяўлення навучання. Заканамерны характар – аптымізацыя прафесійнай адукацыі – грунтуецца на заканамернасцях навучання, сярод якіх былі вылучаны два тыпы:а) аб’ектыўныя, г. зн. законы, уласцівыя кожнаму навучанню, б) суб’ектыўныя – тыя, праяўляюцца ў залежнасці ад характару дзейнасці выкладчыкаі навучэнцаў і, такім чынам, залежаць ад зместу адукацыі і метаду, якім яны карыстаюцца.

Стадыйнасць аптымізацыі праяўляецца ў тым, што яна не з’яўляецца бесперапынным лінейным працэсам, а ўяўляе сабой паслядоўнасць станаў, якая разгортваецца ў часе. Кожная стадыя ў развіцці адрозніваецца якасна новым станам адукацыйнага працэсу і ўключаных у яго суб’ектаў, а механізмам руху ад адной стадыі да іншай выступае пераход колькасных змен у якасныя.

Да ўнутраных фактараў аптымізацыі адносіцца такая заахвочвальная яе прычына, як актыўнасць асобы, г.зн. імкненне да чагосьці новага, незапланаванага ў рамках патрабуемай дзейнасці. Гэта здольнасць суб’екта падымацца над узроўнем патрабаванняў сітуацыі, ставіць мэты, залішнія з пункту гледжання зыходнай задачы.

Дзейнасць аптымізацыі навучання цесна звязана з рацыяналізацыяй працы педагогаў і навучэнцаў і таму спрыяе не толькі паляпшэнню практыкі рашэння якіх-небудзь задач навучання, але і памяншэння перагрузкі выкладчыкаў і студэнтаў. Часцей за ўсё задача педагога складаецца ў тым, каб у кожным канкрэтным выпадку выбраць найбольш ўдалы варыянт навучання, г. зн. найлепшым чынам ўлічыць магчымасці студэнтаў, а таксама прадугледзець рацыянальныя формы арганізацыі і кіравання іх вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю, каб дасягнуць максімальна магчымых вынікаў за мінімальны час.

Так, прыкладам аптымізацыі навучання на філалагічным факультэце з’яўляецца навучанне розным лінгвістычным дысцыплінам выпускнікоў педагагічнага каледжу, якія атрымалі спецыяльную адукацыю па спецыяльнасці “Беларуская філалогія”. Яны атрымалі асноўныя веды па беларускай мове, якія часткова паўтараюцца ва ўніверсітэце. У дадзеным выпадку неабходна не дубліраваць ужо вядомае, а на базе атрыманых звестак адразу паглыбляць і пашыраць іх. Тут асноўным момантам выступае правільная арганізацыя самастойнай работы. Важнейшая асаблівасць самастойнай работы заключаецца не толькі ў тым, што студэнт працуе без непасрэднай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дапамогі выкладчыка, але і ў тым, што рэалізацыя мэт і зместу самастойнай вучэбна-даследчай дзейнасці студэнта спрыяе ажыццяўленню як навучальных функцый, так і функцый асобаснага самаразвіцця, самакіравання і кантролю.

Вядомая выпускнікам каледжа дысцыпліна “Культура і стылістыка беларускай мовы” вывучаецца і ва ўніверсітэце. Таму асноўныя звесткі па стылях беларускай мовы можна сістэматызаваць, прапанаваўшы на занятках лабараторную работу “Функцыянальныя стылі беларускай мовы”. Такі від работы патрабуе не толькі ўмення самастойна працаваць, але і прымянення даследчыцкіх навыкаў, метадаў рэдагавання тэкстаў розных стыляў. На аснове аналізу тэкстаў розных стыляў студэнт робіць вывады аб стылістычнай абумоўленасці выкарыстання моўных сродкаў асаблівасцямі кантэксту, засвойвае прыёмы і спосабы найбольш мэтазгоднага выкарыстання сродкаў мовы ў адпаведнасці са зместам тэксту, яго жанрам і прызначэннем, набывае навыкі свядомага іх выбару, вучыцца рэцэнзаваць тэкст.

Камунікатыўныя якасці беларускай мовы – правільнасць, лагічнасць, дакладнасць, чысціня, выразнасць, дарэчнасць – закранаюцца менш, таму пасля некалькіх лекцый можна прапанаваць выкананне лабараторнай работы “Правільнасць маўлення”. Яна патрабуе добрага ведання мовы, авалодання ўсімі яе нормамі – арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, фраеалагічнымі, лексічнымі, стылістычнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі, што вывучаюцца ў такіх раздзелах мовазнаўства, як фанетыка, марфалогія, семасіялогія, акцэнталогія, сінтаксіс і г. д. Прапанаваныя па розных дысцыплінах заданні зводзяцца ў адной рабоце і патрабуюць ад студэнта не толькі добрых ведаў, але і ўмення аналізаваць тэкст, выправіць памылкі, самастойна адшукаць дадатковую літаратуру па незразумелым заданнях і г. д. Пасля напісання работы студэнт робіць вывад, што асноўная ўвага пры выкладанні курса ‘беларуская мова’ ў школе павінна быць скіравана на правільнасць маўлення, якая прадугледжвае захоўванне носьбітамі мовы літаратурнай нормы і забяспечвае адзінства моўных сродкаў і ўзаемаразуменне паміж гаворачымі.

Вядомы студэнтам – выпускнікам каледжа – і курс “Лацінская мова” – адзін з самых складаных і цікавых пры падрыхтоўцы спецыялістаў гуманітарнага профілю. Яго вывучэнне дапамагае пашырыць агульналінгвістычны кругагляд студэнтаў, садзейнічае выпрацоўцы ў іх навуковага падыходу да сучасных заходнееўрапейскіх моў, паглыбляе разуменне моўных з’яў роднай мовы, міжнароднай лацінскай тэрміналогіі ў галіне гуманітарных навук.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Студэнты валодаюць пэўнымі звесткамі аб граматычнай будове асноўных часцін мовы, аднак не маюць нават мінімальнага лексічнага запасу: іншы раз ім цяжка правесці моўныя паралелі паміж лацінскімі каранямі і беларускімі лексемамі. Таму студэнтам адразу прапануецца засвоіцьлексічны запас. Адбор лексічнага мінімума неабходна праводзіць, зыходзячы з агульнадыдактычных прынцыпаў частотнасці ўжывання лексем, тыповасці, спалучальнасці, узнаўляльнасці ў розных мовах, і дадаць да іх мінімалізацыю вучэбнага матэрыялу, яго соцыякультурную накіраванасць.

Пры гэтым, актуальным застаецца пытанне, як забяспечыць такую метадычную арганізацыю матэрыялу, якая дазволіла б спалучыць камунікатыўнасць з сістэмнасцю мовы. Неабходна помніць, што спецыфікай завочнага навучання застаецца ў значнай ступені самастойнасць вывучэння, таму самай эфектыўнай яго формай з’яўляецца выкананне кантрольнай работы.Так, зыходзячы з вышэйсказанага, кантрольная работа для студэнтаў-філолагаў прадугледжвае выкананне заданняў, у якіх спалучаецца і авалоданне граматыкай лацінскай мовы і ўменне прымяніць свой лексічны запас. Такая кантрольная работа ахоплівае распрацоўку студэнтамі значнай часткі тэарэтычных пытанняў па марфалогіі лацінскіх часцін мовы, патрабуе ўмення прымяніць набытыя веды на практыцы. Наступным этапам пры навучанні лацінскай мове неабходным з’яўляецца далейшая работа на занятках па замацаванню набытых ведаў. Перш за ўсе гэта субяседванне па выкананай самастойнай рабоце. Абавязковымі з'яўляюцца вуснае апытванне, работа з карткамі на практычных занятках, здача лексічнага мінімуму, што дазваляе больш свабодна прыводзіць прыклады пры асвятленні тэарэтычных палажэнняў і, канешне, перакладаць класічныя тэксты.У сукупнасці ўсе віды работы дазваляюць выкладчыку ўдасканальваць працэс навучання лацінскай мове і актывізаваць самастойную вучэбную работу студэнта-завочніка.

Адным з вядучых фактараў аптымізацыіз’яўляецца матывацыя навучання, якаязмяшчае такія кампаненты, як актыўнасць, спантаннасць, творчасць. Творчая актыўнасць характарызуецца тым, што чалавек падымаецца над стандартам, рэалізуючы неардынарныя намаганні для дасягнення грамадска зададзенай мэты.

Галоўным стымулам творчай дзейнасці з'яўляецца імкненне чалавека рэалізаваць сябе, праявіць свае магчымасці. Гэта імкненне ёсць у кожнага і чакае толькі падыходзячых умоў для праяўлення. Таму перад выкладчыкам стаіць мэта – як мага раней развіць у студэнта імкненне да пазнавальнай актыўнай і праяўлення творчых

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

здольнасцей. Вызначальнае месца ў сістэме адукацыі на дадзены момант належыць арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Так, кафедра беларускай мовы прапануе некалькі кірункаў працы з выпускнікамі сярэдніх спецыяльных устаноў.

Перш за ўсё, гэта ўдзел у навукова-даследчых праектах, што выконваюцца выкладчыкамі кафедры. Першы праект звязаны з лінгвістычным даследаваннем сямейна-абрадавай і каляндарна-абрадавай лексікі і лексічных адзінак, звязаных з архітэктурай, будаўніцтвам, назвамі прадметнай лексікі, зафіксаваных у дыялектах Гомельшчыны. Актуальнасць і неабходнасць вывучэння ў наш час традыцыйнай культуры абумоўлена многімі фактарамі: у першую чаргу, недастатковым вывучэннем матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама тым, што ўнікальная матэрыяльная і духоўная культура паступова губляецца пад уплывам фактараў часу, урбанізацыі сельскага насельніцтва.

Для вырашэння гэтых задач можна прыцягнуць студэнтаў каледжа, прапанаваўшы ім сабраць матэрыял у тых месцах, якія слаба даследаваны дыялекталагічнымі экспедыцыямі. Пасля выкладчыкі кафедры дапамогуць апрацаваць атрыманы матэрыял у выглядзе навуковага даследавання – рэфератаў, курсавых і дыпломных работ па этнакультурнай тэматыцы. Іх матэрыял будзе ўключаны ў “Дыялектны слоўнік Гомельшчыны”, а навучэнцы каледжа атрымаюць першы вопыт навуковага даследавання.

Такім чынам, аптымізацыя навучання – гэта дзейнасць па выбары прымальных умоў сістэмы (метадаў, варыянтаў, алгарытмаў) навучання, якая характарызуецца мэтазгоднасцю, альтэрнатыўнасцю і рацыянальнасцю дзеянняў, цэласнасцю працэсу падрыхтоўкі, якія рэалізуюцца адзінствам тэхналагічных, дыялагічных і матывацыйных элементаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ